Источник: "Рэспубліка" - 2016-01-30

# КРАІНА КАЗАК У ДАЛОНІ




Беларускія распрацоўшчыкі мабільных дадаткаў зрабілі праграму «Краіна казак», у якой сабраны ўсе дзіцячыя кнігі, песні і калыханкі на беларускай мове.

Тыя, хто карыстаецца мабільнымі тэлефонамі на базе Android, могуць бясплатна скачаць дзіцячыя песні на словы беларускіх паэтаў, зборнік тэматычных песенек-размінак, некалькі дзясяткаў калыханак, адукацыйныя праграмы і іншае адным файлам у дадатку ў Google Play. Распрацоўшчыкі пастараліся ўключыць у дадатак як сучасныя вядомыя калыханкі, так і аўтэнтычныя спевы з архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН. Таксама ў дадатку можна не толькі слухаць дзіцячыя песні і калыханкі, але і чытаць тэкст гэтых песень, што дазволіць дзецям іх лягчэй вывучыць. Акрамя гэтага, кожны раздзел дадатка маляўніча праілюстраваны, а кнігі цікава агучаны.

Тыя, хто выкарыстоўвае iPad, могуць бясплатна карыстацца амаль аналагічнай праграмай — «Кнігі дзеткам», якую можна скачаць у iTunes.



**Аліна СЯРГЕЕВА**
alinakasel@gmail.com

Аліна Сяргеева. Краіна казак у далоні